# Кропкі судакранання

11 января 2020

У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі працуе выстава «Традыцыі сустракаюцца», падрыхтаваная сумесна з Кітайскай народнай асацыяцыяй сяброўства з замежнымі краінамі. Аказваецца, нягледзячы на тую акалічнасць, што краіны знаходзяцца на розных баках кантынента, у мастацтве Кітая і Беларусі ёсць кропкі судакранання: батык, саломка, мастацтва выразання з паперы, некаторыя віды дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Гэта не першы прыклад супрацоўніцтва. Дзякуючы наладжаным сувязям, напрыклад, у фондах Нацыянальнай бібліятэкі захоўваецца каля пяці тысяч дакументаў, якія тычацца культуры, мастацтва, гісторыі, геаграфіі Паднябеснай.

Выстава складаецца з дзвюх частак: экспанаты, якія прэзентуюць традыцыйныя віды мастацтва Кітая, і творы беларускіх майстроў.

Асноўная «гераіня» выставы — выцінанка. Гэты від дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ўзнік у Кітаі. Дзякуючы гандлёвым зносінам трапіў у Еўропу і распаўсюдзіўся. Адтуль прыкладна ў XVI стагоддзі выцінанка трапіла да нас. І была добра ўспрынята, стала традыцыйным відам мастацтва. Натуральна, што беларуская выцінанка адлюстроўвала беларускі дух. Майстрыхі выкарыстоўвалі традыцыйныя матывы народнай вышыўкі і не толькі. Таксама выцінанкі выконвалі і ўтылітарную функцыю — аздаблялі жытло чалавека. Цікава, што сярод шляхты была распаўсюджана сілуэтная выразка, а народная адрознівалася сіметрыяй і чаргаваннем элементаў. З цягам часу выцінанка ўзбагачалася матывамі, элементамі. Сучасная беларуская выцінанка характарызуецца разнастайнай тэматыкай, тэхнікай выканання, дызайнерскімі рашэннямі, але імкнецца захаваць аўтэнтычнасць.

Прадставілі свае творы, выкананыя ў розных тэхніках, кітайскія майстры Се Чэнфэй, Лань Сяоці, Чжуан Цунцань, Ян Цуаньфу, Чжан Сяоянь, Лі Дэфэнь, Цінь Цзэжун, Чан Лісянь, Чжу Лія, Чэнь Цян, Вань Лін, Чэнь Ін, Шао Лэй. Натуральна, што яны адлюстроўваюць філасофію краіны, нацыянальны каларыт. На працах, выразаных з паперы, — панды, галінкі бамбуку, кветкі лотаса, півоні…

Нашу краіну рэпрэзентуюць творы Настассі Кузьміч, Вольгі Налівайка, Галіны Жураўлёвай, Валянціны Слюнчанка, Веры Янушэўскай, Наталлі Сухой. Кожная аўтарка мае свой адметны стыль і багаты вопыт. У выцінанках увасобіліся вобразы беларускіх міфалагічных істот, жывёл, птушак, раслін, сюжэты песень, абрысы храмаў. Прысутнічаюць класічныя тэмы — дрэва жыцця, поры года, сям'я, мацярынства, народныя святы.

Захапляе вытанчанасць прац, майстэрства выканання. Калі паставіць сабе мэту параўнаць працы кітайскіх і беларускіх майстроў, то адразу стане відавочным, што гэта працы творцаў аднолькава высокага ўзроўню. Творы характарызуюць глыбіня задумы, якасць выканання.

Завітайце на выставу, атрымайце эстэтычную асалоду. І ўпэўніцеся ў тым, што між нашымі культурамі значна больш кропак судакранання, чым вы лічылі дагэтуль.

Святлана Пятрова, фота аўтара









Сегодня стартует «Чистое небо»

Путешествие в другую реальность